Па канфіскаце.

НАША ВОЛЯ

Opłata pocztowa uiszczona ryczałtem

Цана 20 гр.

БЕЛАРУСКІ НЕЗАЛЕЖНЫ ДВУТЫДНЁВЫ ЧАСАПІС

Рэдакцыя і Адміністрацыя: Вільня, Татарская вул. 15-1

Рэдакцыя прыймае: ад 8—10 і ад 14—16

Падпісная плата: у год 3 зл. за паў году 1,50 злот. квартальна 1 зл.

№ 2 (3) Вільня, 21 студзеня 1936 г. Год II

ТУПІКІ.

У мінулым годзе польская прэса, асабліва віленская, многа увагі прысьвяціла школьнаму пытаньню.

За ўвесь час ад паўстаньня Польшчы вялізарныя высілкі былі паложаны на замацаваньне польскага школьніцтва, заснаванага ў нашых вёсках. Кошты панесены вялікія, сілы патрачана многа, а дасягненьні вельмі нязначныя. З усіх бакоў, з кожнага куточка Заходняй Беларусі даходзяць весткі, што польская школа, ня гледзячы на оптымізм афіцыяльных польскіх кругоў, апынулася ў тупіку.

Праўда, у апошні час аб гэтым тупіку чуваць былі галасы і з польскага боку, але неяк яны не знайшлі шырэйшага водгуку.

Толькі на зьездзе польскіх вучыцялёў у Вільні („Кур. Віл.", 15.XII.1935 г.) у палове сьнежня п. Матушкевіч, дыр. польскай вучыцельскай сэмінарыі, ужо прызнае, што „пачаткавая школа, якая мела быць падвалінай цэласьці нашага (польскага, рэд.) школьніцтва, ужо цяпер ёсьць „сьляпой вуліцай", выйсьці з якой бяз спэцыяльнага хатняга давучаньня немагчыма. І вось тут на пачатку заламілася мудрая мысль, якою мы так гардзіліся, — заламілась мысль аднаlітасьці школьніцтва".

Горшага прысуду для школы і для вучыцеля ня можа быць, калі выхад са „сьляпой вуліцы" патрабуе яшчэ хатняга „давучаньня".

І вось, як толькі пачынаецца шуканьне прычынаў, ад якіх паўстаюць тупікі і нізкі ровень польскай школы на нашых землях, адразу на першы плян сама сабой выплывае справа языковая. Пасланка Пэлчыньская, сумуючы ў „Газэце Польскай" (5.XII. 1935 г.) над слабымі вынікамі школьнай працы на Віленшчыне, прыходзіць да вываду, што адною з труднасьцяў, абніжаючых вартасьць школьнай працы, ёсьць незнаёмасьць беларускіх дзяцей з польскаю моваю.

Здавалась бы з гэтага просты выхад — даць беларускаму дзіцяці яго родную школу.

Аднак гэтая справа не так проста вырашаецца.

Віленскі Школьны Куратар на гэта мае свае пагляды. Ен кажа, што беларусы ня хочуць сваёй роднай школы, а дамагаюцца польскай.

Як беларусы „дамагаюцца" польскай школы, нам гэта дакладна ведама. Якія выдаваліся пастановы на дамаганьне беларускіх школ шляхам складаньня школьных дэкляраций, — таксама ведаем.

А дзе-ж тыя некалькі дзесяткаў беларускіх і польска-беларускіх школ, якія паўсталі пад націскам сялянскай стыхіі, як вынік зложаных школьных дэкляраций на дамаганьне беларускіх школ у некалькіх сотках школьных абводаў? Ці так сама сяляне дамагаліся, каб іх ператварылі з беларускіх зноў на польскія? Чаму, напрыклад, у гэтых школах ня было ні аднаго беларуса вучыцеля?

На такія дражлівыя пытаньні дало адказ само жыцьцё.

Нам астаецца толькі падкрэсьліць, што аснаўная засада пэдагогікі, якая заўсёды пры навучаньні высоўвае на першы плян родную мову дзіцяці, да школьніцтва на нашых землях ня мае застасаваньня.

Нават, паводле рэфэрату п. Матушкевіча, рэгулярнае ўчашчаньне дзяцей да школы „тут на Паўночна-Усходніх землях" ня ёсьць пытаньнем школьнага характару, а наадварот пытаньнем „шырокага значэньня грамадзка-дзяржаўнага характару". І таму з такім патосам заклікаў п. Матушкевіч усё вучыцельства „вальчыць" за польскую культуру тут на рубяжох Польскай Дзяржавы.

Кожны народ мае права на сваю культуру.

Беларускі народ таксама павінен падыйсьці да гэтай справы з цьвёрдай воляй.

Школьнае пытаньне неабходна паставіць на парадку дня ўва ўсей шырыні.

Ад вырашэньня гэтага пытаньня ў вялікай меры залежыць наша будучыня — лёс нашых дзяцей.

Школьнымі справамі, дамаганьнем роднай школы, ў першую чаргу павінны заняцца беларускія культурна-асьветныя арганізацыі, прэса, студэнцкая моладзь і ўсё сьвядомае грамадзянства.

„НАША ВОЛЯ".

„Ня кідайце мовы роднай Беларускай,
Каб ня ўмерлі".
БУРАЧОК.

Прайшло колькі гадоў, як араты паўстаў,
Каб за долю сваю пазмагацца, —
Ды ня быў ён гатоў... Занпаў сном вякоў —
Толькі страшныя сны яму сьняцца.

А віхура пары падняла да гары,
Рашчапала на ўшчонт падваліны...
Усё замерла ізноў... Зьледзенела ў нас кроў...
Зайняло нават мову Краіны.

Страшна ўсё ўспамінаць. Сорам людзям казаць
Аб тэй цемры, што нас агарнула...
Але вось Кавалі падняліся ад зямлі, —
„НАША ВОЛЯ" на вёску зірнула.

Сонцам глянула ў твар, прынясла новы дар,
Асьвяціла маланкай Краіну.
Хоць гаротны мужык ўжо да цемры прывык, —
На фундамэнт складзе цэмэнт-гліну.

Гэй, браты! Ну, дык што-ж?.. Хто мо' злот, а хто грош!..
Падтрымаць трэба „НАШУЮ ВОЛЮ"!
Усяк прынуджвай братоў да зьбірай, пакуль кроў
Цячэ ў жылах за лепшую долю.

Хай жыве Беларусь!.. Каб ня спаў беларус,
Хай грыміць наша родная мова!..
Вам, браты-Кавалі, я, маленькі з ральлі,
Скажу шчырае простае слова:

Вы сьвятла авангард. Будзе ўдзячны вам брат
За запал гэтых сьветлых праменьняў.
„НАША ВОЛЯ" наўкол паляціць, як сакол,
Сеяць радасьць сярод пакаленьняў.

Адважней, Кавалі! Дуй ў гарно! Бі! Валі!..
Шлём гарачае Вам прывітаньне!..
Хай грыміць мова-звон! „НАША ВОЛЯ" ня сон,
Усёй Краіны хай воляю стане.

М. ЗВАНАР.

З беларускага жыцьця.

ВЫСТАЎКА АБРАЗОЎ. 8.І. г.г. была зачынена выстаўка абразоў мастака беларуса Пётры Сергіевіча. Выстаўка абыймала пяць апошніх гадоў мастацкай працы і паказала грамадзянству каля паўсотні абразоў, маляваных алейнымі хварбамі, і амаль толькі-ж партрэтаў.

Партрэты асабліва добра выходзяць у Сергіевіча незалежна ад таго, ці робляны яны алейнымі хварбамі на палатне, ці гэта эскізы вуглём на паперы. У кампазыцыях іншых абразоў адчуваецца шуканьне новых шляхоў. Нібы сэрцам вычувае мастак трывогу Беларускага народу за свае лепшае будучае і пераносіць яе на палотны. У некаторых кампазыцыях можа за многа ідэалізму і фантастыкі. Хочацца бачыць больш рэалізму, такога бадзёрага рэалізму, які кліча нас да сьветлых даляў будучыні. Трэба сьцьвердзіць, што ў нашым беларускім жыцьці гэтая выстаўка мае вялікае значэньне: яна сьведчыць, што мы жывем, працуем, здабываем, разьвіваемся...

Маладому мастаку жадаем далейшага разьвіцьця і пасьпеху.

ЛІТЭРАТУРНАЯ СЕРАДА ў польскіх літэратараў 15-га гэтага студзеня была прысьвечана беларускай літэратуры. Аб нашаніўскай пары прачытаў рэфэрат гр. А. Луцкевіч, аб навейшай літэратуры (пісьменьнікі Ўсходняй і Заходняй Беларусі)—гр. Ст. Станкевіч. Пасьля рэфэратаў былі прадэклямаваны творы некаторых беларускіх пісьменьнікаў і паэтаў, як ў арыгінале, так і ў перакладзе на польскую мову. Зацікаўленасьць была вялікая. У канцы вечара саюз абвесьціў, што ў лютым адна серада будзе прысьвечана беларускай музыцы і песьні.

ЗАБАРОНА ЛЕКЦЫЯЎ. Урад Беларускага Студ. Саюзу даручыў сваім сябрам прачытаць на вёсках пад час калядных сьвятаў лекцыі ў беларускай мове на тэмы: „Значэньне коопэрацыі на вёсцы", „Правы нацыянальных меньшасьцяў" і „30-ці летні юбілей Я. Купалы і Я. Коласа". Лекцыі меліся быць прачытаны у паветах Пружанскім, Стаўпецкім і Ашмянскім. Аднак ні адна лекцыя не адбылася з прычыны забароны мяйсцовай адміністрацыяй. Лекцыі былі зацьвержданы Сэнатам Віленскага унівэрсытэту і падпісаны Рэктарам яго, многалетнім міністрам і барацьбітом за незалежнасьць Польшчы, праф. Станевічам.

ВЫХАД „ЗОЛАКУ". Пасьля доўгага перарыву выйшаў з друку № 1 (6) „Золаку", органу беларускай соцыялістычнай думкі.

ДУМКІ І ІМКНЕНЬНІ КОЖНАГА НАРОДУ АДБІВАЮЦЦА Ў ПРЭСЕ. ДРУКАВАНАЕ СЛОВА КАЖА УСЯМУ СЬВЕТУ АБ ІСНАВАНЬНІ НАРОДУ. ДЗЕЛЯ ТАГО ПАДТРЫМАНЬНЕ СВАЕЙ ПРЭСЫ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ГРАМАДЗКІМ АБАВЯЗКАМ КОЖНАГА БЕЛАРУСА.

Чытайце і пашырайце сваю газэту.

Абісынская вайна і Англія.

Вайна ў Абісыніі змусіла ангельцаў мабілізаваць свае аружныя марскія сілы і перавясьці іх з Атлянтыцкага акіяну ў Сяродземнае мора. Чым была выклікана такая нэрвовасьць і пасьпешная мабілізацыя? Натуральна не тым, каб бараніць незалежнасьць Абісыніі.

Замацаваньне Італіі на Абісынскім плоскаўзгор'і — найвялікшая небясьпека для марскіх шляхоў Англіі пры гандлёвых зносінах з яе заморскімі калёніямі. Вось адкуль паходзіць чуласьць ангельцаў да пакту Лігі Народаў і да пакрыўджанай Абісыніі.

Спаборніцтва за рынкі збыту і за гандлёвыя шляхі на моры — галоўная прычына, якая пачала высоўваць на першы плян не дыплёматаў ужо, а адразу марскія баевыя адзінкі, хмары аэрапланаў, падводныя лодкі і г. д.

Аснаўная задача брытанскае ваеннае флёты — забясьпечаньне жыцьцёва-важнага воднага шляху Гібральтар — Мальта — Суэц, гварантуючага беспэрабойнасьць марскога гандлю Вялікай Брытаніі.

(Працяг на адвароце).

Абісынская вайна і Англія.

(Гл. 1 стар.).

Асноўная задача італьянскай флёты — забяспечаньне камунікацыі ў усходняй часьці сяродземнаморскага басэйну.

Гэта так сказаць пачаткава-стратэгічнае заданьне. Важнасьць яго для Італіі відавочна — не дапусьціць, каб армія была адрэзана ад свае базы. Але важнасьць таго-ж заданьня для Англіі вымагае паясьненьняў.

Аказваецца паводле ангельскай статыстыкі ў працягу круглага году любы дзень марскога гандлю Англіі з Індыяй, Аўстраліяй і Кітаем па сяродземнаморскаму шляху цэніцца не больш і ня меньш як 151 мільён фунтаў штэрлінгаў. (Болей 4-х с паловаю мільярдаў злотых). Што тыдня шэсьць мільёнаў тон харчавых прадуктаў і 20 мільёнаў тон брутто розных матэр'ялаў дастаўляюцца па гэтаму шляху ў парты Злучанага Каралеўства.

Каб падтрымаць гэтую вялізарную цыркуляцыю ладункаў, 3,000 транспартаў і параходаў працуюць што дня з поўнаю нагрузкаю: ладуюць і выладоўваюць і безперапынку ідуць туды і назад па Сяродземнаму моры, а па выхадзе ў Індыйскі акіян расьцякаюцца па чатыром напрамкам: На Індыю, Кітай, Аўстралію і Новую Зэляндыю. Перарыў гэтата шляху можа выклікаць вялізарнае зварушаньне ў Англіі. Наладжаная сталетняя сыстэма таргоўлі будзе развалена: тарговы шлях па за Афрыкай, наўкола мыса Добрай Надзеі, падніме фрахты, ударажыць жыцьцё і не можа пазбавіць таргоўлі ад ваеннае небяспекі: вялікія італьянскія подлодкі з 10,000 міль раёнам плаваньня заўсёды змогуць прасьлізнуць ў Атлянтыцкі акіян, як у свой час пападалі туды нямецкія лодкі праз той-жа Гібральтар, або Ляманш. Вось дзеля чаго палітычныя хмары на Сяродземным моры выклікалі раптоўна рэакцыю з боку Англіі, якая безадкладна пераняла сваю Атлянтыцкую флёту ў Сяродземнае мора.

Падобна таму, як сухапутныя сілы расцэніваюцца ня толькі налічнасьцяй армат або танкаў і штыхоў, а галоўным чынам пазыцыйным палажэньнем і сувязьзю з тылам, так і магутнасьць марскіх сілаў не аценьваецца толькі лікам армат або сілай машын, хаця-ж і самай новай канструкцыі, але наяўнасьцяй тылавых, опэрацыйных і манэўраных базаў, іх географічным і стратэгічным палажэньнем і абарудаваньнем. Вось чаму Англія, як толькі пачула небяспеку з боку Італіі для сваіх водных шляхоў, энэргічна пачала дабівацца ад Францыі, каб тая на выпадак вайны дазволіла карыстацца сваімі марскімі базамі для рэмонта і засабленьня флёты топлівам.

Калі-б, напрыклад, Італія перацяла важнейшы водны шлях Брытаніі, то ангельская флёта маючы ключы ад Гібральтара і Суэца можа літэральна задушыць эрытрэйскую італьянскую армію (у Афрыцы), адцінаючы яе цалкам ад тылавое азы.

Галоўнымі сіламі на выпадак вайны некаторыя вайсковыя аўтарытэты уважаюць падлодкі і аэрапляны. У вялікую вайну 2 500 ангельскіх траулераў працавалі цэлы год, каб патапіць 50 нямецкіх падлодак, а тыяж лодкі у працягу 9-х месяцаў патапілі 10 браненосных караблёў, ня кажучы ужо аб 350 гандлёвых. Тыя-ж аўтарытэты уважаюць, што 57 падлодак хопіць, каб заблёкаваць Англію, а італьянцы маюць іх аж 75. Апрача таго італьянцы маюць 2,700 аэрапланаў пад той час, калі ангельцы маюць іх на Сяродземным моры толькі 650.

Натуральна ўсё гэта мае некаторую долю слушнасці. Але на выпадак вайны блёкіраваны раён адразу напоўніцца ангельскімі нішчыцелямі, траулерамі, быстраходнымі маторамі, якія выпаўнілі сваю ролю ў мінулую вайну. У першую чаргу падлодкі спаткаюцца з гэтымі „драбносткамі", пачнецца барацьба за ачыстку мора. У гэтай барацьбе „драбносткі" будуць падтрыманы крэйсэрамі, а за тым і лінейнымі сіламі.

Думаюць, што выйграе той, хто мае больш дрэдноўтаў.

Марская вайна, калі пачнецца, будзе зацяжная.

Але да вайны хіба ня дойдзе, бо яна можа выклікаць новую крывавую завіруху ў Эўропе, аднолькава небяспечную, як для італьянскага фашызму, так і для ангельскага імпэрыялізму. Гісторыя вучыць, што дужыя даходзяць да згоды заўсёды коштам слабага. І цяпер дыплёматы шукаюць формулы, якая задаволіла-б Італію і не закранала-б ангельскіх інтарэсаў. Пра Абісынію гутаркі няма ў такіх выпадках, хаця-ж яна і лічыцца членам Лігі Народаў, на якога зроблены напад.

а.

НА ДАЛЁКІМ УСХОДЗЕ.

Напружанасьць адносінаў паміж Манджурыяй і Вонкавай Манголіяй настолькі завастрылася, што можна спадзявацца хуткага пачатку вайны.

Міністар замежных спраў Манджурыі заявіў, што сытуацыя ў Вонкавай Манголіі ўважаецца „за ненармальную і пагражаючую бязпечнасьці Манджурскае дзяржавы". Гэтая заява сьведчыць аб тым, што Японія зноў, і не на жарты, распачынае новы этап сваей захопніцкай палітыкі.

Апошнія 4 гады Японія, заваяваўшы Манджурыю, якую яна абвясьціла „незалежнай" дзяржавй Манджу-Го, толькі замацоўвала заваяваныя пазыцыі. Зараз, карыстаючыся з Італьянска-Абісынскага канфлікту, які адцягнуў на сябе ўвагу ўсіх вялікіх дзяржаў сьвету, Японія прызнала, што наступіў момант, калі яна зусім сьмела і бяскарна можа распачаць новы этап сваей імпэрыялістычнай палітыкі.

У мінулым лістападзе губэрнатары 5 правінцыяў Пауночнага Кітаю, зразумела, па загаду Японскага вайсковага камандаваньня, выстаўляюць дамаганьне аб прызнаньні незалежнасьці гэтых правінцыяў ад цэнтральнага Нанкінскага ўраду. Чан-Кай-Шэк, галава нанкінскага ўраду, хутка дагаварыўся з японскімі вайсковымі ўладамі ў Кітаі і згадзіўся на утварэньне аўтаномных (самаўрадавых) радаў пакуль толькі ў 2-х з гэтых правінцыяў (Гопеі і Чахару). Урад гэтых правінцыяў будзе складацца з асобаў, назначаных Нанкінскім ўрадам, але рэкамэндаваных японцамі. Пры гэтай „аўтаноміі" японцы дамагаліся, каб самаўрад меў права затрымаць выкананьне грашовай рэформы, якая праведзена ў Кітаі пры падтрыманьні Англіі, але якая вельмі не карысна для інтарэсаў японскага капіталу. Вельмі характэрным пры такой „аўтаноміі" зьяўляецца той факт, што старшыня „аўтаномнага" ураду Сун-Чэ-Ян запрасіў да сябе саветнікам японскага гэн. Дайгара, начальніка японскай разведкі пры квантунскай арміі, які да гэтага часу кіраваў японскай палітыкай у Кітаі. Вось як выглядае „аўтаномія" паўночных праправінцыяў Кітаю. Нанкінскі урад, ня чуючыся здольным арганізаваць абарону інтарэсаў сваей дзяржавы проці захопніцкіх плянаў Японіі, пайшоў па шляху ўгоды, каб толькі захаваць сваю ўладу.

Зусім інакш застасоўваецца да гэтага сьвядомае і арганізаванае грамадзянства. Ведамы кітайскі гэнэрал Хсу-Фанг Цінг, каб паўстрымаць здраду,канчае жыцьцё самагубствам, перад памятнікам бацькі кітайскага вызваленчага руху Сун-Ят-Сэна. Моладзь, арганізаваная ў нелегальныя патрыятычныя саюзы, і кітайскае студэнцтва востра зарэагавалі супроць аўтаноміі, ўведзенае пад прымусам японскіх штыхоў. Забастоўкі і студэнцкія дэманстрацыі ахапілі ўвесь Кітай. У паўночных правінцыях у сувязі з разрухамі зачынены унівэрсытэт, а ў некаторых гарадох абвешчана асаднае палажэньне.

У Нанкіні і Шанхаі студэнты занялі вагзал і не дапускаюць адпраўкі паездоў. У будынак японскага марскога штабу ў Шанхаі кінута бомба. Японскія консульства знаходзяцца пад аховай сваіх жаўнераў. 25-га сьнежня ранены тэрарыстамі міністар Нанкінскаг ўраду Тан-Ю-Жен, які быў прыхільнікам супрацоўніцтва з Японіяй. Па дарозе ў шпіталь Тан-

Вайна ў Афрыцы.

У канцы сьнежня абісынскае войска пасьля бітвы пад Маі-Тімшэт каля ракі Таказзэ пранікнула ў тыл італьянскае арміі і з таго часу ініцыятыва на паўночным фронце знаходзіцца ў рукох абісынцаў. Барацьба ўвесь час ідзе прыблізна на тых пунктах, з якіх пачалося наступленьне італьянцаў. У канцы сьнежня абісынцы пявялі наступленьне і на Аббі-Адi, падчас якога італьянцы страцілі 340 чалавек забітых і раненых. Абісынцы біліся заўзята. У выніку баёў на паўночным фронце абісынцы асягнулі вялікія мейсцовыя пасьпехі, але не здолелі разгарнуць іх у вялікшыя апэрацыі.

Канец году адзначаўся новаю нялюдзкаю дзікасьцю італьянцаў. 30 сьнежня італьянскія лётнікі скінулі бомбы на швэдзкі шпіталь Чырвонага Крыжа, пры чым частка эўрапэйскага персаналю была забітая, галоўны лекар дохтар Хіландэр ранены, а д-р Люндстром памёр ад ранаў. Забіта 28 хворых, што знаходзіліся ў шпіталі. Д-р Хіландэр данёс свайму ўраду, што на шпіталі былі выразныя адзнакі Чырвонага Крыжа і што італьянцы бамбардавалі шпіталь зусім сьвядома. Бамбардаваньне шпіталю, які знаходзіцца пад аховай міжнароднага дагавору выклікала агульнае абурэньне. Негус выслаў пратэст у Лігу Народаў. Швэдзкі ўрад па атрыманьні дакладнае справаздачы ў гэтай справе выступіў перад італьянскім урадам з нотай пратэсту і дамаганьнем адшкадаваньня.

Італьянцы тлумачацца тым, што абісынскае войска быццам хаваецца пад адзнакамі Чырвонага Крыжа. Адначасна італьянцы абвяшчаюць, што абісынцы адрубалі галавы 2 лётнікам, якія былі змушаны спусьціцца на тэрыторыі абісынскіх войск.

Праз некалькі дзён пасьля бамбардаваньня швэдзкага шпіталю, дэпэшы з фронту прыняслі новую вестку аб бамбардаваньні італьянскімі лётнікамі і Эгіпэцкага шпіталя Чырвонага Паўмесяца.

Распачаўшыяся на паўночным участку і ў Агадэне дажджы не даюць магчымасьцяў разьвіць вялікшыя апэрацыі. Дэпэшы д аносяць толькі аб партызанскіх сутычках, у якіх галоўныя сілы ваюючых не прымаюць удзелу. Агэнства Рэйтэра 15 студзеня даносіць, што камунікацыя паміж Адуяй і Макальле перарвана. Вельмі магчыма, што абісынскае войска магло нават заняць Макальле, але з матываў стратэгічных пакуль гэтага ня робіць.

На паўдзённым Самалійскім фронце, паводле афіцыяльнага італьянскага камунікату армія гэн. Гразіані за апошнія дні пасунулася наперад прыблізна на 60 кілямэтраў адпіхаючы войска раса Дэста. Італьянцы выставілі супроць абісынцаў танкі, з якіх косяць кулямётамі войска раса Дэсты. Абісынцы бьюцца заўзята, але змушаны адыходзіць.

ТЫМ ЧЫТАЧАМ, КАТОРЫЯ НЕ АДГУКНУЦЦА ПА ДРУГІМ НУМАРЫ, ВЫСЫЛКА ГАЗЭТЫ БУДЗЕ СПЫНЕНА.

СТАРОЕ ЦІ НОВАЕ?

Мы зьяўляемся сьведкамі вялікага ажыўленьня ў грамадзкім жыцьці, якое сяньня ўскалыхнула шырокімі народнымі масамі. Да актыўнага жыцьця далучаюцца новыя сілы, якія яшчэ ўчора спалі і безнадзейна глядзелі на сяньняшні дзень.

Гэты працэс прабуджэньня грамадзкіх сілаў робіць вялікі пасьпех і ў нашай Краіне сярод гушчаў Беларускага народу. Пад яго магутным ўплывам у грамадзкім жыцьці адбываецца нейкая перастаноўка сілаў, нейкая „пераацэнка вартасьцяў".

Падыходзячы з пункту гледжаньня найбольш балючых народных нтарэсаў, папробуем даць ацэнку праэкту новай праграмы Б. Х. Дэмакратыі, якая мае называцца Народным Аб'еднаньнем. (Глядзі „Бел. Крыніцу" № 46).

Справа ў тым, што аб галоўным прынцыповым пытаньні—аб грамадзкім парадку, які зьяўляецца ідэалам БХД, праграма гаворыць па старому, што „грамадзкі парадак Беларускага народу агулам павінен апірацца на прынцып прыватнай уласнасьці" (§ 18 праграмы). І нічога тут не зьменіцца ад таго, што ў далейшых пунктах гаворыцца аб урэгуляваньні прыватнай уласнасьці, ці нават аб супольнай уласнасьці. Факт застаецца фактам; БХД як стаяла, так і заста额лася на грунце капіталістычнага ладу, які сяньня перажывае такі глыбокі крызыс ва ўсім капіталістычным сьвеце.

Але цяпер мы хочам зьвярнуць увагу чытача на тое, які адказ дае праграма на пытаньні, вырашэньня якіх шукаюць беларускія народныя масы.

Праўда мусім сьцвердзіць, што ў гэтай праграме ужо няма ненавіснага гэтым масам фашыстоўскага духу. Гаворым „ужо няма", бо добра памятуем карпаратыўныя пляны, якія доўгі час сьвяцілі на старонках „Беларускай Крыніцы" Мусаліні-Гітлераўскімі колярамі.

Цяпер сэзон на гэтыя карпаратыўныя фашыстаўскія праекты канчаецца. З задаваленьнем сьцьвярджаем: пакончыла з гэтым і БХД ў сваей новай праграме.

Вось гэта новае, што заслугоўвае на увагу.

Але за гэтым новым зьяўляецца шмат старога, якое выклікае у заправўдных прыхільнікаў нашага народу шмат засьцярог.

Пераглядзім пабежна гэты праект.

Мы ўсе занепакоены лёсам падрастаючага маладога пакаленьня. Мы бачым вырашэньне гэтага пытаньня у стварэньні беларускіх школаў за кошт ураду. Гэта справа зусім ясная. Мы плацім падаткі—значыць з гэтых-жа грошаў маем права дамагацца пакрыцьця буджэту нашых школаў. Інакш гэтую справу ставіць праграма БХД. Яна адразу пакідае дзьверы для зусім недэмакратычнага стану—для утрыманьня школаў на кошт грамадзян. Той, хто сапраўды зьвязаны з штодзенным жыцьцём беларускіх мас, будзе бачыць, што такая пастаноўка пытаньня не адказвае імкненьням нашага народу.

У асобным аддзеле гаворыцца аб найбольш балючай справе для нашых сялян—аб зямлі. І тут трэба проста сказаць, што не жыцьцёвыя інтарэсы шырокіх народных мас кіравалі аўтарамі гэтай праграмы, калі яны пісалі IX разьдзел § 24, што „найбольш адпаведнай формай прыватнай зямельнай гаспаркі БНА уважае гаспадарча самавыстарчальныя хутары". . Безумоўна, гэтая форма найбольш адпавядае багатай частцы нашай вёскі. Няхай-бы так і сказалі аўтары праграмы, але тут мова ідзе „аб найбольш адпаведнай форме" наагул, — а гэта ўжо зусім іншая справа.

Ў праграме даецца адказ на пытаньне, як выйсьці з нэндзы малазямельным і батраком. Высоўваецца лёзунг: зямля бяз выкупу. Гэта вельмі добра. Але наступнае мейсца ў праграме перакрэсьлівае тое значэньне, якое мае гэты лёзунг у сьведамасьці народных масаў і якое ён нават прыймаў на зьездзе Польскага Стронніцтва людовага. У гэтым (28-м) пункце гаворыцца, што разрахунак за зямлю з уласьнікамі праводзіць дзяржава. Тут трэба выбіраць. Або „зямля бяз выкупа" і тады няма ніякіх разрахункаў (бо дзяржава плаціць грашамі народных мас), або гэты лёзунг без ніякага паважнага сэнсу.

Мы закранулі тут вельмі дробную частку справаў, аб якіх гаворыцца ў праграме. Есьць тут новае, дэмакратычнае, але пазасталося многа старага, якое прымаецца за новае, і якое стаіць у вялікай супярэчнасьці з праўдзівым дэмакратызмам.

Да агульных прынцыповых пытаньняў мы яшчэ вернемся.

М. Падлесны.

На далёнім Усходзе.

(Працяг).

Ю-Жен памёр. Ува ўсім Кітаі ідзе ўвесь час напружаная барацьба, адбываюцца дэманстрацыі і вулічныя разрухі.

Ня гледзячы на усё гэтае, Японія лічыць свае пазыцыі ў Паўночным Кітаі досыць моцнымі і рыхтуецца да гаспадарчае працы ў завяваных правінцыях. Як падае японская газэта „Asahi szimbun" японскі ўрад дамагаецца ад парлямэнту крэдыту ў 1 мільён іенаў, які мае быць выкарыстаны на гадоўлю авец і бавоўны, дзеля даставы сырца для японскіх фабрыкаў.

Акупацыя Паўночнага Кітаю была патрэбна Японіі галоўным чынам, як база для далейшых апэрацыяў супроць Манголіі, праз якую яна мае плян захапіць Усходнюю Сібір і Амурскі край, адарваўшы іх ад Савецкага Саюзу.

Хоць дэпэшы з Далёкага Ўсходу і падаюць вестскі аб напружанасьці стасункаў на манджурска-мангольскай граніцы, але паважнейшых апэрацыяў у кірунку Манголіі ў зьвязку з комунікацыйнымі умовамі можна спадзявацца не раней вясны. Апрача таго вялікаю небясьпекаю зьяўляюцца для Японіі і разрухі ў Паўночным Кітаі.

Шукаюць аблічча.

Выхад нашага часапісу як і трэба было спадзявацца, выклікаў, вялікае зьдзіўленьне і перадусім на віленскім грунце.

Зьявішча такое зусім натуральнае.

Да гэтага часу „ходалiся" паміж сабою два палітычныя напрамкі: беларуская хадэцыя і, так званая, беларуская санацыя. Адносіны так склаліся, што па-за гэтымі групамі вытваралася пустка ў беларускім грамадзка-палітычным жыцьці. Гэтая пустка моцна давала сябе адчуваць, як тут у Вільні, так і ў масах на правінцыі. Нехта павінен быў выражаць волю той часткі беларускага грамадзянства, якая не належыць ані да санацыі, ані да хадэцыі.

І вось над той час, калі ўсё беларускае грамадзянства спаткала выхад „Нашай Волі" спакойна, заняла пазыцыю прыгляданьня да нашага твару, — адзін толькі „Родны Край", орган польска-беларускага ТБА, рассыпаўся ў злосных выпадах пад нашым адрасам.

Асабліва пакрыўджаны „Родны Край" за ведамага беларусаеда, ідэолёга польскіх абшарнікаў, п. Цата, разам з якім лямантуе далей, што Толстой ўсё-ж такі забойца (мордэрца) свайго народу.

Мы не памыліліся ў сваіх вывадах. Дзеці цемры адгукнуліся. Заварушыліся, якраз на беларускім балоце.

Гэта нас не страшыць. Наадварот, пацьвярджае нашае становішча: ніякіх выпадаў процiў суседніх народаў (прыкладам, як у „Родным Краі") на сваіх старонках мы не дапусьцім. Палякі, украінцы, літоўцы, расейцы, як нацыі заслугоўваюць на поўную пашану. З беларускім зоолёгічным нацыяналізмам, які прышчэпліваe нашаму народу ненавісьць у адносінах да суседніх народаў, мы будзем бароцца, як і з кожным іншым. Будзем уважаць гэта за правакацыю нашага неакрэпшага народу.

Ані Толстой, ані расейскі народ таксама не патрабуюць нічыёй абароны. Мы лічылі толькі сваім абвязкам, карыстаючыся выступленьнем абшарніцкае „Слова", паказаць беларускім масам, чаму абшарнікі ненавідзяць Толстога, — паказаць, як з расейскага грунту перафлянсаваны на польскі грунт дух чорнай сотні — гэтага заядлага ворага ўсіх паняволеных народаў. Аказалася, што гэты дух на беларускі грунт, хоць і хаваючыся, але нясе орган ТБА „Родны Край". Сваяцтва з п. Цатам поўнае.

Забаўляючыся гіроніяй над Толстым і расейскім народам, „Родны Край" адначасна пазваляе запаўняць свае шпальты, хоць нічога ня вартымі, але ўсё-ж расейскімі вадзвілямі яшчэ з пачатку мінулага сталецьця, прыкладам „Шустрай бабулькай".

Вось вам і культура.

Бяручы пад сваю абарону польска-абшарніцкае „Слова", „Родны Край" выстраліў у наш бок наступнаю тырадаю:

„Дзіўна, што супрацоўніку беларускай (!) „Нашай Волі" гэтак блізкія да сэрца інтарэсы... расейскай нацыі. Дый як разумець размеры гэтай нацыі? Можа, як даўней: „от Кавказа до Алтая, от Амура до Днепра", або „от хладных фінскіх скал до пламенной Колхиды"? Тады справа зусім зразумелая: прымай, беларусе, талстоўскую пропаведзь і расплывайся „в русском море", каб ніколі не разьвітацца з сваім нявольніцкім лёсам, як той эгіпэцкі фэлах".

На гэта можам адно сказаць: расплывацца „в русском море", як і ў польскім не зьбіраемся; будаваць Беларусь „от шалтая до болтая" таксама не маем ніякага замеру, пакідаем такія рэчы „Роднаму Краю", якому гэта зусім да твару. У нашу праграму не ўваходзіць такжа разьбіваць праца ў беларускім руху і таму мы ня будзем марочыць во чы свайму народу ні „Кавказом", ні „Алтаем", што быццам тады дачакаемся шчасьця, калі там ня будзе расейскай нацыі. Прапаведзь Талстога, асабліва калі ён выступае процi нацыянальных уціскаў, для нас можа быць толькі карысная. Ну.. а нявольніцкі лёс эгіпэцкага фэлаха уважаем куды болей завідным, чым лёс такога нявольніка, якім зьяўляецца „Родны Край": фэлах умее вясьці змаганьне за сваю незалежнасьць, а якое „змаганьне" і за якую „незалежнасьць" вядзе „Родны Край" — Беларускі народ даўно знае.

В. М.

Два працэсы.

— Ад 8 да 13 гэтага месяца ў Вільні адбываўся суд над студэнтамі і асыстэнтамі Віленскага Унівэрсытэту, абвінавачанымі ў камуністычнай дзейнасьці. Засуджаны: Друта (ліцьвін) на 5 гадоў з пазбаўленьнем праваў на 8 гадоў, Ліфшыц (жыд), і Смаль (беларус) на тры гады кажды з пазбаўленьнем раваў на 5 гадоў. З прычыны амнэстыі усім засуджаным кара зьменьшана на палову. Шэсьць абвінавачаных палякоў і два беларусы апраўданы. Працэс гэты выклікаў зразумелае заінтэрасаваньне з боку ўсяго віленскага грамадзянства бяз розьніцы палітычных паглядаў.

— 13 студзеня закончыўся ў Варшаві вялікі палітычны працэс Арганізацыі Украінскіх Нацыяналістаў справе забойства мін. Перацкага. Галоўныя абвінавачаныя — Бандэра, Лебэд і Карпынец прыгавораны на кару сьмерці, якая з прычыны амнэстыі заменена на вечную катаргу. Клымышын і Підгайны засуджаны на вечную катаргу, Карпынец — на 15 гадоў, Малюца, Качмарскі і Мыгаль — на 12 гадоў, Зарыцкая — на 8 г., Чорный і Рак — на 7 гадоў. Усе яны былі абвінавачаны ў арганізацыі забойства, пасля якога дапамаглі Мацейцы, які забіў міністра Перацкага, уцячы ў Чэхаславаччыну.

З усяго сьвету.

— Міністрам Замежных Спраў Англіі назначаны Антон Ідэн дасюляшні міністр пры Лізе Народаў. Міністр Ідэн зьяўляецца прыхільнікам Лігі Народаў і асабістым ворагам Мусаліні. Як кажуць яны не зносяць адзін другога Назначаньне Ідэна выклікала задаваленьне сярод сымпатыкаў Лігі Народаў і спаткала таксама прыхільнае адношаньне і з боку СССР.

— У канцы сьнежня у Парыжы адбылася нарада прадстаўнікоў ангельскага і францускага ген. штабаў.

— 24 сьнежня а 7 гадз. у веч. в Гроссхерінген (Нямеччына) пасьпешны цягнік наехаў на пасажырскі. 6 вагонаў было дашчэнту разьбіта, адзін упаў у раку. Падчас крушэньня было 33 забітых, 10 цяжка і 50 легка раненых.

— У Нямеччыне з 20 сьнежня ўведзены карткі на тлушч. Выдаецца па ¼ фунта тлушчаў у дзень.

На Новы Год мін. Гэббэльс прачытаў перад мікрафонам навагоднюю праграмовую прамову Гітлера, якая надавалася праз усе нямецкія радыёстанцыі. Гітлер сказаў, што ў наступаючым 1936 годзе Нямеччына будзе і далей павялічваць і ўзмацоўваць сваю армію, якая павінна быць забясьпеке свабоды і разьвіцця нямецкае нацыі. (Алнэй з галоўных мэтаў гітлерызм ставіць барацьбу з Комінтэрнам.)

— Бэльгійскі кароль Леапольд III другі раз выехаў у Лёндан. Гэты візыт, як запэўнае прэса, знаходзіцца ў сувязі з крытычным палажэньнем Мусаліні і магчымым упадкам фашызму. Кароль Леапольд, які знаходзіцца ў сваяцтве з італьянскім і ангельскім каралеўскімі дамамі, выехаў быццам з мэтаю выясьніць, якую пазыцыю займе Англія на выпадак агульна-эўрапэйскай вайны.

— Ангельскі высокі камісар у Палестыне абвесьціў праект самаўраду для гэтага краю. Праект прадбачыць стварэньне Законадаўчае Рады, з правам дарадчага голасу. Рада павінна складацца з 11 арабаў, 7 жыдоў, 3 хрысьціянаў, 2 прадстаўнікоў гандлю і 5 прадстаўнікоў ангельскіх урадаў. Арабы схіляюцца прыняць праект, але жыды гбяцца вострую апазыцыю. Найхарактэрнейшым ў праекце зьяўляецца тое, што прадбачыць ён ня выбары самаўраду насельніцтвам, але назначэньне.

— У Парыжу падпісана францускa-савецкая гандлёвая ўмова, якая увайшла у жыцьцё ад 7 студзеня с. г.

— У Гішпаніі абвешчаны дэкрэт прэзыдэнта аб роспуску парлямэнту і вызначэньні новых выбараў на 16 лютага.

— Нарвэжскі ўрад падаў у каралеўскую раду праект поўнае раўнапраўнасьці для жанчын. Праект прадбачыць ня толькі права жанчын быць міністрамі, але дапускае іх да пасад вайсковых, дыпляматычных, а нават і духоўных.

— У Лёндане распачала працы міжнародная марская конфэрэнцыя. Старшынёю абраны мін. Ідэн. На самым пачатку выявіліся вялікія разьбежнасьці паміж Японіяй і іншымі дзяржавамі. Японія дамагалася права мець вайсковую флёту такую, як і іншыя дзяржавы. Паразуменьне ня было асягнута і дэлегаты Японіі афіцыяльна пакінулі конфэрэнцыю.

У Польшчы.

Новае распараджэньне ў справе конвэрсіі. Распараджэньнем Міністра Фінансаў ад 21 сьнежня м. г. срок падпісываньня конвэрсыйных умоваў з землярobамі прадоўжаны да 31 кастрычніка 1936 г. Апрача таго распараджэньне прадбачыць, што ў першыя два гады даўжнікі будуць забавязаны плаціць толькі ⅔%, а сплата доўгу распачнецца толькі з 3-га году. Агульны тэрмін раскладкі доўгу пазастаецца стары, г. зн. 14 гадоў. Па умовам, якія падпісаны па водле старога закону, сплата першых чатырох ратаў пераносіцца на час пасьля апошняе раты ўсталенае умовам.

Стан безрабоцьця. Паводле статыстычных дадзеных у Польшчы на дзень 1 студзеня была зарэгістравана 393.644 безработных.

Катастрофа пад Вільняй. У начы на 8 студзеня на лініі Вільня-Маладэчна, на 9 кілямэтры за Новай Вілейкай здарылася чугункавая катастрофа. Ахвяры — 1 забіты і 25 раненых.

Новы Міністар камунікацыі. Міністар Камунікацыі інжынер М. Буткевіч вышаў у адстаўку, а на яго мейсца назначаны дыпляматывы палкоўнік Ю. Ульрих.

Усячына.

Матылі у студзені. Сёлетняя зіма адзначаецца даўно ненатаваай у такім стопню цяплынёй. У падморскіх паветах Польшчы распускаецца бэз, а рыбакам удалося зляпіць некалькі прыгожых матылёў. Гэта ёсьць тым больш цікавым, што студзень у гэтых паветах залічаецца да найбольш сьцюдзёных месяцаў.

Прэса ў 1935 г. Паводле статыстыкі з 1 студзеня 1935 г. у Польшчы было 1859 часапісаў, у гэтым польскіх 1567, украінскіх і жыдоўскіх па 72, нямецкіх 97, францускіх 12, расейскіх 11, беларускіх 8, ангельскіх 4. Штодзенных газэт выходзіла 152. У 1932 г. выходзіла іх 168.

Праект узгадаваньня дзяўчат у Нямеччыне. Гітлероўскі орган „Арбайтсманн", дамагаецца увясьці ў нямеччыне ўзгадаваньне дзяўчат паводле ўзгору старадаўняй Грэцыі. І так, яны мусяць, згодна з рэцэптам, паданым у гэтай газэце, спаць на голай саломе, не павінны маляваца, пудравацца і спажываць салодкіх рэчаў. Вопраткі дзяўчат павінны быць найбольш скромныя і пазбаўленыя усякае кокетэрыі.

Хто зарабляе на вайне. Амэрыканскі фабрыкант аружжа Морган прадаў у часы сусьветнае вайны ваенных прыладаў на 363 мільёны даляраў. Як відаць ня ўсе могуць скардзіцца на вайну.

Орган левіцовай моладзі „Front Młodych" у артыкуле п. н.: „Крывавы інтэрнацыянал зарабляе", падае некалькі характэрных фактаў. Крызыс не даецца адчуваць у фабрыках ваенных прыладаў. Пяць буйнейшых францускіх фірмаў зарабілі на гэтым інтарасе 121 мільён франкаў. Пры гэтым Францыя не зьяўляецца асяродзьдзем ваеннага промыслу. Наагул фабрыкі не публікуюць сваіх даходаў, але па процэнтах, якія выплачваюцца учасьнікам, можна ўцяміць, што даходы іх растуць, як на дражджох. Шведская фабрыка армат у 1930 г. дала 4,790,000 карон чыстага даходу, а у наступным 3,040,000 карон.

Фабрыкі ваенных прыладаў належаць найбольш да інтэрнацыянальнага картэлю, і, прыкладам, нямецкая фабрыка Круппа, выраблаючая арматы, каторыя будуць забіваць францускіх салдатаў, прыносіць даход таксама і францускім капіталістам. З другога боку нямецкія капіталісты маюць грашовыя уклады у францускіх, італьянскіх і ангельскіх фабрыках ваенная амуніцыі.

Зацьменьне месяца. 8 студзеня сёлятняга году было зацьменьне месяца. Бачыць яго было немагчыма дзякуючы густым хмарам. Праф. Варшаўскага Унівэрсытэту Гадомскі падняўся на балёне да 3000 м. Падняцца вышэй было немагчыма з прычыны вялікага сьнегу, які, абляпляючы балён, перашкаджаў яму падымацца. На зямлі ў той час ішоў дробны густы дождж. Хмары пачаліся ад 400 м. алеі на вышыні 3000 м. яны ня скончыліся і таму абсэрвацыя не ўдалася.

Зацьменьне відна было і ў Абісыніі. Етыёпы верылі што злыя сілы паляць месяц. Яны маліліся ўсю ноч і скакалі рэлігійныя танцы. Гэтае незразумелае для іх зьявішча выясьнялі, як знак памысная заканьчэньня вайны.

З жыцьця вёскі.

Зіма. Горад. Безрабоцьце. Турботы аб хлебе штодзенным. Але разам з тым летнія ўраженьні не сьціраюцца.

Яркімі жывымі вобразамі праходзяць вясковыя тыпы, малюнкі, праца. Ёсьць многа сумнага і многа сьветлага, сьвежага, прыемнага.

Заходняе Палесьсе. Беларускіх арганізацыяў няма. Але беларуская сьведамасьць народная жыве і пашыраецца. Звычайны рабочай, вясковы хлапец, адараны ад жыцьця культурных цэнтраў, даходзіць да вывадаў, характэрных для нашых часоў:

— Тэхнічная і духовая культура людзкая вельмі разьвіта, далёка шагае, але затое моцна адстае культура маральная. Таму няма добрага сужыцьця ў адносінах паміж людзьмі.

Прыходзіцца дзівіцца, з якім смакам падкрэсьліваецца слова „маральная". Брак культуры наагул, а маральнай асабліва, на Палесьсі адчуваецца балюча.

Спатыкаецца група маладых сялян. Зноў гутарка зводзіцца на справы культуры і асьветы.

— Ваш абавязак — гарадзкіх жыхароў — дапамагчы нам кніжкамі. Знайдзеце нам у горадзе цікавых кніжак, грошы мы сабяром і вышлем.

З вялікім зьдзіўленьнем прышлося выслухаць, як добра на вёсцы разьбі-

(Далей на ст. 4-ай).

З жыцьця вескі.

(Працяг).

раюцца ня толькі ў пытаньнях палітыкі сягоньняшняга часу. Чытаюць Талстога, Крапоткіна, Рубакіна, нават Оссэндоўскага, Плеханава, і шмат іншых імёнаў. Зусім добра прастудыявана, як для вясковых хлапцоў, гісторыя 19 ст.

— Адкуль і як трапляюць кнігі на вёску?

— Галоўным чынам з эміграцыі.

— А як-жа беларускія, чытаеце?

— Есьць і беларускія. Толькі гэта зьвязана з труднасьцямі. Бачыце віводнай бібліятэкі на вёсцы не пазастала. Але ўсё роўна цікавыя кнігі ходзяць па руках за 50 клм., і каму трэба заўсёды іх можна знайсьці.

Кніга сама прымушана вандраваць па вёскам. Асаблівы спосаб шуканьня асьветы.

Натуральна ня ўсе так чытаюць. Есьць і такі элемэнт, які ўмее хуліганіць. Але лепшая частка, якая фактычна кіруе грамадзкім жыцьцём вёскі,ня се ўзапраўды маральную культуру, змагаецца, як можа, за свае ідэалы. Гэтая частка сялянства на дзіва інтэлігэнтная і шляхотная. Яна зраслася з фізычнай працай і прыродай, але ніколі ў вольную хвіліну не растаецца з кніжкай.

Карэспандэнцыі.

В. КАРАБЫ, Ашмянскага павету. Сам я мала граматны. Разумеючы, як цяжка жыць у цемры, я хацеў бы бачыць сваіх дзяцей адукаванымі людзьмі. Але бяда ў тым, што сын мой хоць чатыры ўжо гады ходзіць у школу і знаходзіцца ўжо ў другім аддзеле, чытаць дагэтуль не ўмее. Я думаў спачатку, што ён кемны на другія гаспадарскія рэчы, да навук зусім ня здольны. Але калі я прыглядзеўся да другіх дзяцей, дык і там справа стаіць не лепей. Рэдка каторае дзіця па сямігадовай адукацыі ўмее чытаць ды пісаць. Дзе-ж тут шукаць віны?

Раз пытаецца мяне мой вучань: „Што гэта значыць „пес ішчэка?", Аказалася, што разумеў ён слова „шчэка", як „чакае". Вось праз гэтыя дробныя факты можна ўцяміць, дзе ляжыць жарало нашае трагэдыі. Якіх-жа можна спадзявацца вывікаў, калі дзіця зусім не разумее вучыцеля? Толькі родная школа дала-б нашым дзецям асьвету і магла-б разагнаць пануючую над вёскай цемру.

Сумны.

АЛЬШАНЫ, Ашмянскага павету. Нядаўна на вёску прышлі весткі аб абніжцы цэнаў на некаторыя прадукты першае патрэбы. Аграмадная прорва вытварылася ў крызысовыя гады паміж цэнамі вясковых і гарадзкіх прадуктаў. Абніжка цэнаў на апошнія выклікала вялікае зацікаўленьне на вёсцы. Газа патанела да 35 гр. за літр, цукер да 1,40 у кавалках і 1 зл. 5 гр. пясок. Праўда цукру ў вас амаль што ніхто з сялян ня купляе, і лепш патрэбнай была-б абніжка цаны на соль, на мыло. Але тут прышло расчараваньне. Амаль ня разам з абніжкай цаны на цукер і газу палараджаля мыла (кавалак, каторы каштаваў 20 гр., каштуе цяпер 25 гр.) Газэты пішуць, што прычынай высокіх цэн зьяўляюцца картэлі. Мы нявучаныя ня ведаем добра, што гэта такое картэлі, але ведаць, што гэта спрытная хаўра на пітаністаў, каторая скрыўдзіць сябе ня папускае. Капіталісты, змушаныя абніжаць цану адных прадуктаў, адбіваюць сваё на другіх.

Чоромха.

ЗАДУБЕНЬНЕ, Крывіцкае гміны, Вялейскага пав.

Дня 31-XII-35 г. адбылася ў нашай вёсцы публічная лекцыя, прачытаная сябрам Галоўнае Управы ТБШ Рыгорам Шырмаю. Тэма лекцыі: „Літэратура ў жыцьці грамадзянства і адзінкі". Нягледзячы, што быў будні дзень, аднак публікі зыйшлося вельмі шмат, нават былі і такія, каторым прыходзілася ісьці пехатою якіх 7 кілямэтраў. Труды іх зусім аплаціліся, бо рэфэрат быў прачытаны, запраўды, памастацку і змог захапіць усю публіку. Што гаварыць, калі нашыя вясковыя сяляне ніколі ня чулі нічога навучнага ў сваёй роднай мове. Гэта быў нейкі пераварот у яго душы, бо што-ж можа быць прыгажэйшае над яго роднае слова. Гэтае магутнае слова, як звон, званіла з вуснаў лектара, узымала душу да нейкіх новых палётаў, паддавала крытыцы ўсё сваё пражытае, паказвала новыя шляхі.

Рэфэрат закрануў найбольш жыцьцё паняволеных людзей: як нэграў у Афрыцы, паншчыну ў царскай Расеі, нацыянальную няволю. Мы напрыклад уcачылі, як літэратура спрычынялася да перабудовы грамадзкага ладу. Рэфэрат усебакова закрануў літэратурныя ўплывы на псыхіку чалавека, на яго ўзгадаваньне.

Як сама тэма, так і чытаньне яе задаволіла ўсіх, і кожны выходзячы думаў, каб хоць раз яшчэ пачуць падобны рэфэрат. Бура воплескаў была падзякаю лектару за яго труды.

М. Под

Паштовая скрынка.

Мацей Званар. Пісьмо Ваша і вершы атрымалі. Газэту будзем высылаць на Ваш адрас. Цешымся, што вашы словы закранулі жывыя струны Вашай душы і Вы адгукнуліся шчырым родным словам, да „незнаёмых Вам людзей". Дзякуем за добрае слова, за Вашы пажаданьні, за падпіску. Пішыце карэспандэнцыі аб жыцьці вёскі, заахвочвайце новых падпісчыкаў, тады газэта наша будзе разьвівацца.

Самойліку Аляксандру. Пераказ пасылаем. Другі № быў пасланы на імя Гіца Антона. За прывітаньне шчыра дзякуем.

Кольпортэр газэт Р. Баскір. Першага экзэмпляру выслалі 27 штук. Далей будзем высылаць па 50.

Марцінчыку В. Газэту і пераказ высылаем. „Наша Воля" імкнецца да таго, каб бараніць інтарэсы селяніна і работніка.

Барысу Паўлу. Паштоўку і грошы атрымалі. Дзякуем. Часцейшы выхад часапісу залежыць ад усяго грамадзянства. Кожны, пашыраючы газэту, зьбіраючы ахвяры і прысылаючы карэспандэнцыі, будзе спрычыняцца да гэтага.

Гурыну Я. Паштоўку атрымалі. Газэту высылаем. Чакаем падпіскі.

Рапёўцу Дымітру. Пробны нумар высылаем.

Баравіку Міхалу. Грошы атрымалі. Дзякуем.

Жыгаліну Базылю. Газэту высылаем. Грошы атрымалі.

Бублею К. На паданыя адрасы газэту высылаем. Кожны мае магчымасьць спрычыніцца да часьцейшага выхаду газэты.

Кашчэўскай І. Падпіску атрымалі. За прывітаньні дзякуем.

Хлябічу Уладзіміру. Падпіску атрымалі, газэту высылаем.

Гуніку Ф. За пісьмо дзякуем. Па паданых адрасох газэту высылаем.

Глушыну Фр. Картатэку ўжо маем. Газэту высылаем.

Чэрніку Ф. Газэту і пераказ высылаем.

Ярашэвічу С. Падпіску атрымалі.

Хвызе І. А. Падпіску атрымалі.

Пузыне Яну. Падпіску атрымалі. Шчыра дзякуем за памяць. Пішыце карэспандэнцыі.

Будаўлянаму Работніку. За карэспандэнцыю дзякуем. Пастараемся выкарыстаць. Пішыце болей.

Грому Піліпу. За падпіску дзякуем.

Босакову Мацею. За пісьмо дзякуем. Ахвотна зьмесьцім карэспандэнцыю аб прадстаўленьні. У меру магчымасьці прысылайце весткі з вясковага жыцьця. За грошы дзякуем. Па паданых адрасох газэту высылаем.

Курыловічу П. Падпіску атрымалі.

З прычыны непаразуменьня тэхнічнага характару, грошы тых падпішчыкаў, каторыя выслалі іх пераказамі разрахунковымі, былі звернены поштай назад. Рэдакцыя высьвятліла гэтую справу і радзіць прысылаць прэнумарату разрахунковымі пераказамі, што значна таней каштуе. Калі ў мейсцы прызначаным для карэспандэнцыі не напісана нічога, ці дадаецца толькі заўвага, а якую мэту высылаюцца грошы, то перасылка зусім бясплатная. Калі-ж пішацца больш, то трэба плаціць 15 гр., як за карэспандэнцыю.

ЗАПІСВАЙЦЕСЯ

на Беларускія Агульнаадукацыйныя Курсы, якія вядзе ад 1-га лютага 1936 году Віленскі Цэнтральны Гуртог Т-ва Беларускае Школы.

Курсы будуць абымаць наступныя прадметы:

1) Гісторыю Беларусі—10 лекцыяў.

2) Агульную географію Эўропы і пазаэўрапэйскіх краін — 10 лекцыяў.

3) Географію Беларусі — 5 лекцыяў.

4) Палітычную эканомію (асновы грамадзкай гаспадаркі) — 5 лекцыяў.

5) Гісторыю Беларускай літэратуры — 10 лекцыяў.

6) Космографію (навука аб зорах і плянэтах)—5 лекцыяў.

7) Натуральную гісторыю зямлі (паверхня, слаі зямлі і іх паўстаньне, расьлінны і зьвярыны сьвет і іхняе разьвіцьцё).

8) Гісторыя культуры і цывілізацыі.

Курсы пачынаючы ад 1936 году будуць весьціся стала кожную зіму ад 1 лістапада да 31 красавіка. У сёлетнюю зіму курсы пачнуцца 1-га лютага, будуць трываць тры месяцы (да 31 красавіка) і абымуць толькі чатыры першыя прадметы:

1) Гісторыю Беларусі, 2) Агульную Географію, 3) Географію Беларусі і 3) Палітычную эканомію.

МЭТА КУРСАЎ: даць і паглыбіць агульную веду аб бацькаўшчыне і сьвеце, паняліччыць гэтым самым грамадзкую вартасьць адзінак, карыстаючых з курсаў.

Лекцыі будуць уложаны папулярна, даступна, каб з курсаў мог карыстаць кожны, хто ўмее чытаць па беларуску.

Лекцыі будуць друкавацца на павелячы. Курсы будуць весьціся бясплатна. Толькі на пакрыцьцё коштаў (папера, пошта, кошты друку і інш.) трэба прысылаць 2 зл. месячна, значыць 6 зл. у тры месячныя раты за цэлы сёлетні курс (30 лекцыяў).

Мы ведаем, што нават гэтая невялікая плата на пакрыцьцё коштаў, будзе ў цяперашнія цяжкія часы многім не пад сілу. Каб гэтаму зарадзіць і зрабіць Курсы даступнымі для ўсіх, заклікаем да выпісваньня лекцыяў у складчыну. Асабліва карысным будуць курсы для існуючых гурткоў ТБШ і іншых культ.-асьветных арганізацыяў у працы пашырэньня веды сваіх сяброў.

Лекцыі будуць рассылацца поштай больш меньш па дзьве на тыдзень. Запісываючыся на курсы трэба прыслаць плату за першы месяц і наступныя інфармацыі аб сваёй асобе: 1) Імя і прозьвішча, 2) Мейсца і год нараджэньня, 3) Прафэсія (чым займаецца), 4) Дакладны адрас. Калі лекцыі выпісваюцца цэлай групай, дык трэба падаць дакладныя дадзеныя аб усіх асобах з групы і на каго слаць лекцыі.

ГРАМАДЗЯНЕ! Помніце, што веда, гэта магутнае аружжа ў змаганьні за лепшую будучыню, і таму выкарыстайце вольныя час, які ёсьць зімой у вёсцы, каб праз Курсы здабыць і пашырыць сваю веду.

Нам, беларусам, тым больш трэба здабываць веду саматугам, бо родная школа, у якой кожны сын культурнага народу дастае гэтую веду,—для нас тымчасам недаступная роскаш. Помніце, што ніхто нам не паможа, калі мы самі сабе не паможам. Часовы адрас для карэспандэнцыі: Вільня, Крулеўская вул. № 3, кв. 8, Беларускі Банк, Курсы.

Вільня ў сьнежні 1935 году.

Урад Віленскага Цэнтральнага Гуртка.

Абвесткі.

Хто да гэтуль ня купіў Беларускага адрыўнога календара, хай пастараецца яго хутчэй купіць, бо календароў на рынках ужо засталася мала. Купіць можна у гандляроў на рынках, а таксама ў крамах. Цана 50 гр. Пры больших закупах вялікая зьніжка. Галоўны склад: Вільня, Вострабрамская 2, Кнігарня Ст. Станкевіча.

Беларускі Народна-Гаспадарскі Календар - кніжка на 1936 год (гражданкаю)

больш**ы — 70** грошаў

меньшы **— 45** грошаў.

Biełaruski Narodny Kalendar-knižka na 1936 hod (łacinkaj), большы 96 стар. ЦАНА 50 гр. і меньшы 48 ст. ЦАНА 40 грошаў.

Як „Беларускі Народна-Гаспадарскі Календар", так і „Biełaruski Narodny kalendar" маюць стары і новы стыль, усход і заход сонца і іншае. Апрача таго у абодвух календарох ёсьць розны, галоўна гаспадарскі, цікавы і карысны зьмест. Купляйце ў прадаўцоў усюды на рынках і ў крамах. З Вільні найлепш выпісаць з Галоўнага Складу (Заречная вул. 14—7, І. Станкевіч), або з Беларускай Кнігарні, Ст. Станкевіча. Вострабрамская 2, Пры больших закупах вялікая зьніжка.

Адказны Рэдактар і Выдавец ВІНЦЭСЬ СКЛУБОЎСКІ. Друкарня І. Баеўскага. Вільня, Татарская вул. 13.